ВОЛЬНЫЙ ТРУД
БЕЛОСТОК

8 - ОКТ. 40

## Сустрэча з артыстамі тэатра Юнага гледача

Днямі ў 9-ю сярэднюю школу прышлі ў госці кіраўнікі і артысты мінскага тэатра Юнага гледача, які гастраліруе зараз у Беластоку. Рэжысёр В. Меероўскі выступіў перад вучнямі старшых класаў з дакладам аб жыцці і творчасці Нікалая Остроўскага. Артыст Стэльмах расказаў, як калектыў тэатра працаваў над пастаноўкай спектакля «Як гартавалася сталь».

Мастацкі кіраўнік тэатра тав. Сухарэў пазнаёміў прысутных з рэпертуарнымі планамі тэатра ў будучым.

* * *

Сёння ў беластоцкім Доме пісьменніка ў 8 гадзін вечара адбудзецца арганізаваны гаркомам партыі і камсамола і калектывам тэатра Юнага гледача вечар, прысвечаны абмеркаванню пастаноўкі п'есы «Як гартавалася сталь». З дакладам аб творчасці Н. Остроўскага выступіць рэжысёр тэатра тав. Меероўскі.